Я - беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую, і здаля.
*(Н. Гілевіч)*

***22 верасня*** (чацвер) ў 11-х класах прайшоў конкурс на лепшага чытальніка “Чытаем вершы пра родную мову”. Вучні з захапленнем прадставілі вершы Ніла Гілевіча, Максіма Танка, Петруся Броўкі, Янкі Купалы і іншых. Хлопчыкі і дзяўчынкі вельмі натхнёна і эмацыйна выказвалі сваю любоў да роднай мовы і Бацькаўшчыны. Гучалі вершы “Мова” Анатоля Грачанікава, “Роднае слова” Янкі Купалы, “Мая мова” Рыгора Барадуліна, “Матчына мова” Алеся Бачылы. Выканаўцы вершаў былі ўзнагароджаны, а заключным словам стаў верш Надзеі Шылавец “Роднае матчына слова!”.

Роднае матчына слова!
Не забыць мне цябе, не згубіць.
Ты, як водар, напоены хлебам,
Ты, як птушка, што ў небе ляціць.
Не пачуўшы цябе, паміраю.
А пачуўшы, ускрэсну ізноў.
Як матулю, цябе я кахаю,
Да цябе не пагасне любоў!
І ліецца ад краю да краю
Мова нашых бацькоў і дзядоў.
І таму я ўсім наракаю:
Не згубіце вы матчыных слоў!






***Настаўнік беларускай мовы Кайданава В.В.***